УДК 821.161

*Г.М. Ішчанка*

# АГУЛЬНАЧАЛАВЕЧАЕ І НАЦЫЯНАЛЬНАЕ Ў ЭСЭ У. КАРАТКЕВІЧА «SAXIFRAGA»

У артыкуле асэнсоўваецца рэцэпцыя У. Караткевічам жыцця і творчасці класікаў украінскай літаратуры Тараса Шаўчэнкі і Лесі Украінкі. Зроблены гісторыка-функцыянальны аналіз эсэ «Saxifraga».

Лёс прывёў Уладзіміра Караткевіча на зямлю Украіны ў гады ваеннага ліхалецця. Будучы пісьменнік разам з маці трапіў у Кіеў адразу пасля яго вызвалення ад фашыстаў. Аўтабіяграфічная аповесць «Лісце каштанаў» (1974), нарыс «Мой се градок!» (1982) надзвычай ярка і эмацыйна перадаюць успрыманне старажытнага горада вачыма хлопчыка-падлетка. Як і родны горад У. Караткевіча Орша, Кіеў раскінуўся на берагах Дняпра – калыскі славянскай культуры. Рака яднала любімыя гарады і народы. Атмасфера старадаўняга велічнага стольнага горада выклікала ў душы У. Караткевіча разуменне сэнсу свайго чалавечага прызначэння. Пісьменнік прызнаецца: «…Я паступова адчуў галоўнае ўва мне, прыналежнасць да Вялікай Гісторыі Славян, да гісторыі народаў, у тым ліку да ўкраінскага, што складаюць маё племя. Уваходзіў у галоўную справу майго жыцця: асэнсаванне нас, сённяшніх, асэнсаванне таго, хто мы ёсць сёння і куды мы ідзём, – праз асэнсаванне нашага ўчора» [3, с. 116].

Восенню 1944 года сям'я Караткевічаў вярнулася на Беларусь. У Оршы юнак закончыў сярэднюю школу і ў 1949 годзе паступіў вучыцца на філалагічны факультэт Кіеўскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Праз гады, ацэньваючы свой юнацкі выбар, ужо вядомы пісьменнік адзначыць: «І я, відаць, не дужа памыліўся, прадчуваючы, што менавіта там мне ўдасца лепей зразумець мінулае ўсходнеславянскіх народаў, чым яно ў кожнага народа падобнае і чым адметнае» [3, с. 118]. Кіеўскі ўніверсітэт спраўдзіў спадзяванні беларускага студэнта. Юнак шмат працаваў у яго бібліятэках, архівах, меў доступ да старадрукаў, перыёдыкі мінулых гадоў. Праз усё жыццё У. Караткевіч пранёс удзячнасць сваім выкладчыкам, што падтрымалі яго духоўныя памкненні, дапамаглі авалодаць культурай навуковай і творчай працы. У вершы, прысвечаным акадэміку А.І. Бялецкаму, ёсць радкі, якія вельмі дакладна перадаюць гуманістычную сутнасць той настаўніцкай дапамогі:

О, як трэба шукаць на шляхах чалавека,
Як любіць, берагчы, не крыўдзіць яго,
Каб пабачыць *славу наступнага века* (вылучана намі – *Г.І.*)
У сэрцы сціплага сына суседа свайго! [1, с. 150].

Прыведзеная цытата сведчыць таксама і аб тым, што ўжо на пачатку творчага шляху (верш напісаны ў 1950-х гг.) малады паэт прадбачыў сваё месца ў гісторыі нацыянальнай культуры.

У. Караткевіч дасканала ведаў украінскую мову, літаратуру, гісторыю, мастацтва. У часы вучобы ва ўніверсітэце яго нават абвінавачвалі ва ўкраінскім нацыяналізме. Беларускі пісьменнік захапляўся жыццём і творчасцю Т. Шаўчэнкі, І. Франко, Лесі Украінкі. У свой запаветны гістарычны раман «Каласы пад сярпом тваім» У. Караткевіч увёў эпізадычны вобраз Тараса Шаўчэнкі. Галоўны герой рамана князь Алесь Загорскі сустракаецца з Кабзаром у Пецярбургу і схіляе галаву ў знак пашаны перад жыццёвым і творчым подзвігам былога прыгоннага. Вуснамі свайго

любімага героя, носьбіта аўтарскай пазіцыі, У. Караткевіч ацэньвае ролю Тараса Шаўчэнкі ў развіцці гістарычнай свядомасці нашчадкаў: «А толькі… гіне народ, калі на пачатку ягонай дарогі не з'явіцца такі, як вы (Шаўчэнка. – *Г.І.*), без кампрамісаў… З часам мірыяды людзей сальюцца ў любові да вас, таму што вы нідзе не саступалі, таму што справа ваша – высакародная, таму што такой любові, як ваша, яшчэ пашукаць на зямлі. Такой любові, калі адзін чалавек ратуе цэлы народ» [2, с. 184]. Т. Шаўчэнку прысвечана эсэ У. Караткевіча «І будуць людзі на зямлі» (1964).

Прыклад Т. Шаўчэнкі не толькі натхняў У. Караткевіча, але станавіўся ўзорам для грамадскай дзейнасці, аб чым сведчыць аўтарскае прызнанне: «Часам, у злыя гадзіны, я нават не ведаю, ці люблю я беларусаў, да якіх маю гонар належаць. За бязмежную цярпімасць да таго, чаго не трэба, за мяккасць, што мяжуе з рэптыльнасцю, за тое, што яны занадта сумленныя і «верныя Янукі». Але нават у тыя хвіліны я разумею, з пагардай да самога сябе (бо яны – гэта я), што адна справа не любіць чалавека і зусім іншая – не ратаваць яго, калі ён топіцца. Я стану ратаваць. Нават цаною гэтай паношанай шкуры і спрацаваных мазгоў, якія падсохнулі ўжо і тарахкаюць. І хаця на таўшчыню воласа, наколькі хопіць маёй сілы, я прыбліжу да іх паратунак. *Уратую іх*» [4, с. 181].

Быць прарокам у Айчыне даволі няпроста. У. Караткевіч, як ніхто іншы з беларускіх пісьменнікаў, адчуваў на сабе цяжар гэтай місіі, аднак не драматызаваў сітуацыю. У яго дзённіку ёсць запіс, поўны годнасці і мужнасці: «Пакуль самаасэнсавання няма, трэба проста, *горда і самотна рабіць сваю справу* (вылучана намі – *Г.І.*), не зважаючы ані на якія пляўкі, поўхі, страты. Відаць, пры такім становішчы біць будуць з усіх бакоў. Што ж, і гэта набытак. Такім, па-мойму, пакуль што яшчэ ніхто не мог пахваліцца. Калі вытрымаем – значыць, тытаны і не памрэм. Калі не вытрымаем – туды нам і дарога, шэлег нам кошт і смецце нам магіла. І іншага мы не варты. І хай яны тады здыхаюць, такія ўладары думак і такі народ, не пераводзяць дарма хлеб. Таму што кожны купляе права на жыццё маральнай стойкасцю, веліччу душы, у якую ніхто не мае магчымасці запусціць лапы» [4, с. 183].

Як сведчаць сучаснікі У. Караткевіча, самым цяжкім перыядам у жыцці пісьменніка была другая палова 1960-х – пачатак 1970-х гадоў, калі распачалося сапраўднае цкаванне аўтара «Каласоў пад сярпом тваім», калі ў кожным яго радку бачылі крамолу. «Побач з Васілём Быкавым Уладзімір Караткевіч успрымаўся тады ў Беларусі як галоўная асоба ў супрацьстаянні кансерватыўным колам, як найбольш небяспечны парушальнік спакою» [5, с. 97].

У няпросты жыццёвы перыяд У. Караткевіч напісаў эсэ «Saxifraga» (1971), прысвечанае Лесі Украінцы. Гэтым творам беларускі пісьменнік адгукнуўся на стагоддзе з дня нараджэння славутай валынянкі. Твор У. Караткевіча далучаў беларускага чытача да жыццёвага і творчага подзвігу Лесі Украінкі. У эпоху таталітарызму пераконваў сучаснікаў у тым, што свабода мастака вызначаецца не столькі знешнімі абставінамі, колькі ўнутраным светам асобы, яе духам і воляй. Жанр эсэ дазволіў У. Караткевічу стварыць не толькі захапляльны вобраз мужнай пісьменніцы, але і выказацца пра балючыя праблемы сучаснасці, выявіць майстэрства пісьменніка, публіцыста, перакладчыка. (У мастацкую тканіну эсэ ўключаны творы Лесі Украінкі, перастворавыя на беларускую мову У. Караткевічам).

Напэўна, каб заінтрыгаваць чытача, для назвы свайго эсэ У. Караткевіч выбірае лацінскае найменне расліны ламікамень – гэты вобраз выкарыстала ў сваёй творчасці Леся Украінка. Ва ўспрыманні беларускага пісьменніка названая кветка – мастацкае ўвасабленне няскоранага духу фізічна кволай, але надзвычай мужнай жанчыны. У даступнай займальнай форме У. Караткевіч запрашае чытача асэнсаваць не толькі крыніцы таленту Лесі Украінкі, але і каталізатары яе духоўнай энергіі. Расказваючы

пра бацькоў славутай валынянкі, беларускі пісьменнік звяртае ўвагу чытача на той факт, што бацька Лесі паходзіў «з паўночнай Чарнігаўшчыны, ледзь не з Беларусі» [3, с. 154]. Ад бацькі, лічыць аўтар эсэ, дзяўчынка ўзяла ў спадчыну «не толькі вонкавыя рысы, але і дабрыню бязмежную, цярплівасць, паблажлівую лагоднасць, сілу волі, бескарыслівае сумленне, крайнюю прыстойнасць, здольнасць хутчэй моўчкі пакутаваць самому, чым прыносіць пакуты іншым, і велічэзную павагу да годнасці чалавечай…» [3, с. 154]. Маці, украінская пісьменніца Алена Пчылка, выпеставала ў дзіцяці «здольнасці і ўкраінскае сэрца».

У. Караткевіч нібы запрашае чытачоў эсэ зрабіць завочную экскурсію па Валыншчыне, з любоўю апісвае Лесін беленькі дамок і непаўторныя палескія краявіды, народныя святы. Далучэнне дзіцяці да фальклорных традыцый спрыяла ўсведамленню Лесяй рэгіянальнай адметнасці краю, пераканання ў тым, што «мы не чарнігаўскія і не палтаўскія, а мы палешукі». На думку У. Караткевіча, наведванне дзецьмі ваколіц возера Нячымнага, гутаркі з пасечнікам Львом (які пазней стаў прататыпам дзядзькі Льва са славутай «Лясной песні») выпрацоўвалі ў душы Лесі адчуванне еднасці з Палессем, краем легенд і паданняў. Нездарма ў канцы жыцця душа ўжо вядомай пісьменніцы зноў вярталася сюды, ў край маленства, на святую зямлю бацькаўшчыны, з далёкай Грузіі, і за дзесяць-дванаццаць дзён была створана «Лясная песня». У. Караткевіч захапляецца гэтым творам, разважаючы аб яго жанры, адзначае: «Я не ведаю лепшага ў гэтым жанры. Бо гэта не п’еса, не драма, не феерыя нават, а вялікая паэма жыцця гэтай лясной і вадзяной зямлі» [3, с. 167].

Эскізна ў творы перадаецца цырымонія свята Вадохрышча, у час якой дзесяцігадовая таленавітая валынянка застудзіла ногі і на ўсё жыццё была распята на пакутніцкім крыжы невылечнай хваробы: «Палонка… Крыж з лёду, увянчаны голубам… Марозная пара ад вады… Чырвоныя ў сцюдзёным сонцы рызы… І вось праз два гады ўсё гэта адгукнулася» [3, с. 155].

Вінавацячыся перад чытачамі за жорсткасць, У. Караткевіч, аднак, прызнаецца, што ў страшнай бядзе, якая напаткала Лесю ў дзяцінстве, ён схільны бачыць «зерне станоўчага». Падставай для такіх высноў сталі назіранні аўтара за лёсам многіх жанчын-паэтэс, якія паклалі свой талент на алтар сям’і. «Уявім сабе, – піша У. Караткевіч, – уся энергія, уся любоў, увесь боль пайшлі б туды» [3, с. 161].

Адмежаваная ад сяброў-равеснікаў, знаходзячыся ў самоце, Леся самастойна авалодала дзясяткам замежных моў. Ліпучыя кайданы з гіпсу не перашкодзілі жанчыне няўтомна працаваць на карысць свайго народа, стаць «дасканалай паэтэсай, драматургам, празаікам.., цікавым і бездакорна праўдзівым і справядлівым крытыкам і публіцыстам, значным гісторыкам, этнографам, фальклорыстам, музыказнаўцам» [3, с. 156].

Сучаснікі, сябры У. Караткевіча, у сваіх успамінах пра пісьменніка адзначаюць яго выключную працаздольнасць. Творчая спадчына аўтара эсэ сведчыць пра шматграннасць таленту У. Караткевіча, апантанае служэнне ідэі нацыянальнага, духоўнага адраджэння народа. Прыкладам для У. Караткевіча былі лёсы яго папярэднікаў – М. Багдановіча, Лесі Украінкі. Пісьменнік, якога часта папракалі за кніжнасць, адарванасць ад надзённага жыцця, лічыў, што ў «асобе Лесі Украінкі ва ўкраінскую літаратуру ўвайшло тое, чаго не хапала ў той час і ўкраінцам і нам: спалучаныя з высокай ідэяй інтэлігентнасць, вытанчанасць і, пры ўсёй нацыянальнай стыхіі, Сусветнасць у самым вышнім сэнсе гэтага слова. У нас гэта зрабіў Багдановіч, у іх – яна» [3, с. 161].

У падтэксце гэтай ацэнкі чуецца клопат У. Караткевіча пра стан літаратурнага жыцця ў 70-я гг. ХХ ст. Пісьменнік балюча перажываў негатыўнае стаўленне некаторых крытыкаў да яго гістарычнага рамана «Каласы пад сярпом тваім». Аповед пра дзейнасць Лесі Украінкі можна разглядаць як яшчэ адну спробу абудзіць

гістарычную свядомасць суайчыннікаў. З захапленнем расказвае У. Караткевіч, як небагатая, хворая ўкраінская пісьменніца на свае грошы арганізавала ў 1908 г. фальклорную экспедыцыю на Палтаўшчыну, каб зрабіць запісы дум і гістарычных песень, якія «выміралі ўжо тады». У. Караткевіч піша: «Сабрана было… два тамы. Да выдання другога Леся не дажыла. Але гэта таксама помнік ёй, вялікай выратавальніцы скарбаў» [3, с. 157].

Беларускі пісьменнік, захапляючыся ўчынкам Лесі, не мог не адзначыць, што лёс нашых нацыянальных скарбаў менш шчаслівы: «Царскія служкі знішчылі найбольш адметную, паэтычную, найбольш гістарычную з'яву быцця народнага» [3, с. 158]. У. Караткевіч свядома згадвае ў эсэ назвы беларускіх гістарычных песняў, якія чула яго маці ў выкананні лірнікаў, што хадзілі па вясковых хатах. Гэтыя спевы, пачутыя на кірмашы ў пасляваеннай Оршы, выклікалі ў Караткевіча слёзы. Пісьменнік так тлумачыць іх прычыну: «І плакаў, як усе вакол; плакаў, можа, не столькі ад спеваў, колькі ад адчування, што прысутнічаю пры сконе чагосьці гонарнага і велічнага. Таго, што ў самыя клятыя і чорныя часы не давала згаснуць святому адчуванню, што мы гордыя і вялікія людзі, калі мы стварылі такое» [3, с. 158]. Аналагічную рэакцыю выклікалі ў душы У. Караткевіча і спевы кабзароў: «Заплачкі, галошанне беларускае і паўночна-ўкраінскае, – вось што гэта нагадвала» [3, с. 159]. У велічным, спакойным і трагічным галашэнні бандурыста бачыцца У. Караткевічу «парастак гармоніі вышэйшай» [3, с. 159].

На думку пісьменніка, подзвіг Лесі Украінкі выяўляецца не толькі ў творчасці, у абароне слова і песні, але найперш у абароне годнасці чалавека і краіны. У. Караткевіч цытуе ў сваім эсэ фрагменты з гнеўнага артыкула пісьменніцы «Голас адной расійскай зняволенай», які мужная валынянка даслала ў французскую газету «La Reform», пасля таго, як увосень 1896 года рускага цара і царыцу віталі ў Парыжы не толькі афіцыйныя колы, але і некаторыя музыканты, артысты, пісьменнікі. Словы Лесі Украінкі былі надзвычай прыдатнымі і для ацэнак сацыяльнага і нацыянальнага жыцця ў СССР. Савецкая гістарыяграфія замоўчвала праблемы нацыянальнай дыскрымінацыі народаў у царскай Расіі. Паўстанне пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага інтэрпрэтавалася як сялянскі бунт супраць прыгону. Гістарычны раман У. Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім», у якім пісьменнік паспрабаваў праўдзіва адлюстраваць пярэдадзень паўстання 1863 г., з вялікай цяжкасцю прабіваўся да чытача. Афіцыйная крытыка папракала пісьменніка ў парушэнні гістарычнай праўды. У эсэ Караткевіч згадвае, што рэдактар рамана «моцна пакрэмзаў» у адным раздзеле прамову чарнасоценнага прафесара Руніна, бо палічыў, што гэтай прамовай пісьменнік абражае суседні народ, прадстаўнікі якога не маглі так гаварыць пра сваіх малодшых братоў. У. Караткевіч прызнаецца, што ў аснову прамовы Руніна пакладзены думкі Рыціха, выкладзеныя ў кнізе «Пакрыўджаны край». Аўтар «Каласоў пад сярпом тваім» прыводзіць у эсэ цытаты з названай кнігі, дзе зневажаецца нацыянальны і чалавечы гонар беларусаў і ўкраінцаў. Згадваюцца ў творы і афіцыйныя дзяржаўныя дакументы, паводле якіх украінцам забаранялася ўжыванне роднай мовы. Аднак сіла закону аказалася слабейшай за сілу духу Лесі Украінкі. У. Караткевіч піша: «І хто б уступіўся за галодных і паняволеных, за радзіму, каб не Тарасаў цень, каб не Іван Франко, каб не гэтая слабенькая, кволая жанчына» [3, с. 162].

Заслуга ўкраінскай пісьменніцы бачылася У. Караткевічу яшчэ і ў тым, што «яна ваявала не толькі супраць прыгнятальнікаў, але і супраць хутарскога беспардоннага «патрыятызму», які лёкайствуе перад моцнымі, ліжа ім рукі, кідаецца ад гучных лозунгаў да халуйства… Супраць патрыятызму галушак і світак за патрыятызм адукаванай грамады, якая, вядома, і галушак не забыла, але дайшла да вышынь духу чалавечага, культуры чалавечай» [3, с. 163]. Гэтыя радкі можна ўспрымаць

і як водпаведзь У. Караткевіча тым крытыкам, якія абвінавачвалі пісьменніка ў адрыве яго творчасці ад жыцця, заклікалі пісаць у рэчышчы сацыялістычнага рэалізму. Леся Украінка была блізкай У. Караткевічу і па духу, і па творчых эстэтычных прынцыпах. Робячы інтэрпрэтацыю творчасці ўкраінскай пісьменніцы, ён адначасова тлумачыў чытачу і свае мастацкія прыярытэты. У. Караткевіч адзначае, што многія драматычныя творы Лесі Украінкі пераносілі чытачоў у далёкія краі і далёкія вякі, і гэтая акалічнасць успрымалася як загана. Беларускі пісьменнік не падзяляе пазіцыю некаторых даследчыкаў, уступае ў палеміку.

«Сучасная ёй – і не толькі сучасная – крытыка, – гаворыць пісьменнік, – часта рабіла паэтэсе закіды і папрокі ў «экзатычнасці». Я аніяк не згодзен з ёю. Тут не «экзатычнасць», а ўся тая самая праблема адхілення творчай думкі, што, ва ўмовах нецярпімасці і самавольства, блукае па чужых краінах, па краінах гісторыі, па краінах казкі» [3, с. 167]. Творчая думка У. Караткевіча таксама адкрывала беларускаму чытачу невядомыя старонкі занядбанай нацыянальнай гісторыі, абуджала гістарычную памяць. Сваю незаконченую аповесць, якую некаторыя даследчыкі лічаць працягам рамана «Каласы пад сярпом тваім», аўтар назваў «Зброя».

Сімвалічны сэнс гэтай назвы можа быць спасцігнуты праз асэнсаванне ацэнкі У. Караткевічам ролі Лесі Украінкі ў духоўным жыцці ўкраінскага народа: «Яна ведала мэту лепей за многіх, ведала шлях да яе. І сродкі дасягнення гэтай мэты як ніхто… *Спакойна і мужна рабіла сваю справу* (вылучана намі – *Г.І.*). Не яе справа была біцца. Яе справа была куць і сталіць зброю, якой, урэшце, перамогуць воіны яе народа, воіны ўсіх прыгнечаных зямлі, воіны, створаныя спецыяльна дзеля таго, каб перамагаць. Слова яе ўражвала, нішчыла, біла – значыць, перамагала і яна» [3, с. 163].

Аўтарскае сцверджанне сёння ўспрымаецца і як самаацэнка У. Караткевічам уласнай жыццятворчасці, разгорнутым тлумачэннем таго, што будзе пасля ўкладзена ў радкі верша: «Быў. Ёсць. Буду».

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Караткевіч, У. Збор твораў : у 8 т. / У. Караткевіч. – Мінск : Маст. літ., 1987. – Т. 1. – 538 с.
2. Караткевіч, У. Збор твораў : у 8 т. / У. Караткевіч. – Мінск : Маст. літ., 1989. – Т. 4. – 530 с.
3. Караткевіч, У. Збор твораў : у 8 т. / У. Караткевіч. – Мінск : Маст. літ., 1991. – Т. 8. Кн. 2. – 495 с.
4. Караткевіч, У. У дарозе і дома: З запісных кніжак / У. Караткевіч // Полымя. – 1989. – № 1. – С. 164 – 183.
5. Мальдзіс, А. Жыццё і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча: Партрэт пісьменніка і чалавека / А. Мальдзіс. – Мінск : Маст. літ., 1990. – 230 с.

***Ishchanka H.M.*** **Uladzimir Karatkevich's Essay «Saxifraga»**

The subject of the article is Uladzimir Karatkevich's perception of the life and creative work of the classics of Ukrainian literature Taras Shevchenko and Lesya Ukrainka. The author has made historical and functional analysis of the essay «Saxifraga».

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 12.02.2011